# Школьная планета

**_НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!_**

**_№ 6 (53) ЛЮТЫ 2019_**

_Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”Мінскай вобласці_




**_«Я вас ніколі не забуду», «Мы назаўсёды застанемся сябрамі», «Абавязкова будзем сустракацца кожны год» – колькі падобных абяцанняў чуюць штогод школьныя сцены?_**

_Толькі жыццё ўносіць свае карэктывы: дарогі разыходзяцца, інтарэсы мяняюцца... Аднак ёсць дзень у календары, калі кожны можа хаця б на вечар акунуцца ў бесклапотнае дзяцінства, убачыць аднакласнікаў, настаўнікаў, успомніць школьныя цудоўныя гады._









# Акцыя “Сябруем з Законам!”




**Міжведамсная прафілактычная *акцыя «Сябруем з Законам!»* стартавала з 8 лютага. Мэтамі акцыі з'яўляюцца фарміраванне ў дзяцей і моладзі ўсвядомленых законапаслухмяных паводзінаў, прывіццё ім духоўных і маральных каштоўнасцей, імкнення да здаровага ладу жыцця.**

У рамках акцыі, якая завяршылася 23 лютага, былі праведзены спартыўныя і культурна-забаўляльныя мерапрыемствы па прававым выхаванні. Усе мерапрыемствы былі накіраваны на спыненне супрацьпраўных дзеянняў з боку падлеткаў, а таксама дарослых, якія ўцягваюць непаўналетніх у антыграмадскія паводзіны.

Ва ўстанове адукацыі ў гэтыя дні прайшлі пазакласныя гадзіны, лекцыі, віктарыны, круглыя сталы з дэманстрацыяй відэаролікаў.



**Пратаіерэй Ілья Ганчарук з прэзентацыяй выставы “Моладзь за жыццё, маральнасць і сямейныя каштоўнасці”**



**Сустрэча-дыялог з настаяцелем Храма Прыабражэння Гасподняга святаром Васіліем Васільковым на тэму “Хрысціянскі погляд на праблему залежнасцей”**



**Турнір знаўцаў права “Я і закон”**





**Сустрэча з начальнікам інспекцыі па справах непаўналетніх Бярэзінскага РАУС Крывянковым А. В.**

***Дом, у якім утульна ўсім!***
**berezino2.school.by** *№ 53, люты 2019 г.*

# *Хто за радзіму гарой, той герой!!!*



***21 лютага ўпершыню за многія гады ва ўстанове адукацыі прайшоў конкурс “Агляд строю і песні”, у якім прынялі ўдзел вучні 9-11 класаў. Гэты конкурс стане добрай традыцыяй нашай школы, а вучням з 9-11-х класаў выпаў велізарны гонар даць пачатак гэтай добрай традыцыі. Конкурс праходзіў у два этапы. На першым этапе кожны клас паказваў сваё майстэрства маршыраваць, уменне выконваць каманды камандзіра і правільна, прыгожа выконваць страявую песню ў руху. На другім этапе хлопцы спаборнічалі ў стральбе з пнеўматычнай вінтоўкі, хадзілі страявым крокам у пары, а дзяўчаты спаборнічалі ў накладанні першаснай асептычнай павязкі (чапец). Лепшым у стральбе стаў навучэнец 10 “Б“ класа Карпаў Кірыл; Гайдук Дар'я, навучэнка 10 “А” класа, прадэманстравала лепшы вынік у накладанні павязкі, а перамогу атрымаў 10 “Б” клас.***

***Паліна Кузіна***







ЦТ в Беларуси стартует 11 июня по белорусскому языку. ЦТ по русскому языку пройдет 13 июня, по обществоведению - 15, по математике - 17, по биологии - 19 июня. Тестирование по иностранным языкам по графику Минобразования запланировано на 21 июня. Химию будут сдавать 23 июня, физику - 25, историю Беларуси - 27, географию - 29 июня. ЦТ по всемирной истории (новейшее время) состоится 1 июля.

Регистрация для прохождения ЦТ будет проводиться со 2 мая по 1 июня.

Установлены резервные дни для проведения ЦТ: 6 и 8 июля по белорусскому и русскому языкам и 6 и 10 июля - по остальным предметам. График ЦТ утвержден постановлением Министерства образования от 26.02.2019 г. № 20. В нем содержится перечень УО, определенных пунктами регистрации для прохождения ЦТ и пунктами проведения тестирования. Пункты регистрации будут открыты с 9.00 до 19.00 по будням и с 9.00 до 18.00 по субботам (18 мая и 1 июня).

Зарегистрироваться для прохождения ЦТ в резервные дни можно будет с 30 июня по 2 июля. Тестирование в эти дни проведут в БГУ. Время начала ЦТ - 11.00. Получить сертификаты абитуриенты смогут в пунктах проведения тестирования с 10 июля, в БГУ (резервные дни) - с 13 июля.

Информация размещена на Национальном правовом Интернет-портале Республики Беларусь и на сайте

## Подготовка к ЦТ-2019

# Гісторыя, якой можна ганарыцца

**7 лютага ў рамках XXVI Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу адбылася прэзентацыя выдання “У рытме імклівых гадоў... Нарысы гісторыі камсамола Беларусі”, якое пабачыла свет у 2018 годзе ў Выдавецкім доме “Звязда”.**




*Гэтае выданне, несумненна, можна назваць знакавым і ўнікальным: прывітальныя словы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі і міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь старшыні Рэспубліканскага аргкамітэта па святкаванні 100-годдзя камсамола Ігара Карпенкі, прадстаўнічы склад аўтараў, большасць з якіх маюць вопыт працы і камсамоле і БРСМ, найцікавейшыя малавядомыя факты з архіваў Беларусі і Расіі, больш за 300 рэдкіх архіўных фотаздымкаў і фотакопій дакументаў, успаміны камсамольскіх лідараў мінулых дзесяцігоддзяў — сапраўдны падарунак да 100-годдзя камсамола ўсім пакаленням камсамольцаў, а таксама сённяшнім маладым беларусам з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй.*

*Як адзначыў на прэзентацыі рэдактар-складальнік і адзін з аўтараў выдання, дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ, вядомы гісторык і палітолаг Вадзім Гігін, такое даследаванне, дзе была б так падрабязна прааналізавана гісторыя камсамола Беларусі з моманта яго нараджэння і да сённяшніх дзён, не выходзіла ўжо 40 гадоў. Але гэта толькі пачатак вялікай даследчай працы. Плануецца, што ў 2020 годзе, калі будзе адзначацца 100-годдзе непасрэдна беларускага камсамола, выйдзе новая, значна дапоўненая звесткамі, дакументамі і навуковымі высновамі кніга аб гісторыі і сучаснасці маладёжнага руху ў Беларусі.*

*Мікола ЧЭМЕР для прэс-цэнтра Міністэрства адукацыі.*

***(матэрыял падрыхтавала Аліна Жукоўская)***

***17 августа 2019 года учреждение образования «Национальный детский образовательно-оздоровительный центр «Зубренок» отметит 50-летие со дня своего образования.***

***НДЦ «Зубренок» по праву является флагманом детского отдыха и оздоровления, пользуется заслуженным авторитетом у воспитанников и педагогов, занимает достойное место в системе современного образования.***

***НДЦ «Зубренок» стал настоящей школой формирования у детей и подростков нравственных, гражданских и патриотических качеств. Поездка в НДЦ «Зубренок» для каждого ребенка является наградой за отличную учебу и успехи в социально значимой деятельности. Для многих воспитанников время, проведенное в центре, стало стартовой площадкой для достижения новых успехов.***

Национальный детский образовательно-оздоровительный центр «Зубрёнок»
Учреждение образования
Министерства образования Республики Беларусь

## “Здай батарэйкі – захавай планету!”



Усе мы жывем на планеце Зямля, яе называюць “блакітнай планетай” або “зялёнай планетай” за яе прыгажосць, непаўторнасць. Жыццё ўсіх жывых арганізмаў, у тым ліку і наша жыццё, шмат у чым залежыць ад стану навакольнага асяроддзя. І сёння гэта разумее кожны жыхар планеты. З кожным годам мы ўсё мацней адчуваем існуючыя экалагічныя праблемы. І пры гэтым, многія з нас не задумваюцца, што стан навакольнага асяроддзя напрамую звязаны з нашымі паводзінамі ў побыце, у прыродзе.

Жыццё чалавека пастаянна знаходзіцца ў руху, уласна, як і навукова-тэхнічны прагрэс. Велізарная колькасць сучасных вынаходак мае патрэбу ў аўтаномных крыніцах энергіі – акумулятарах і батарэйках.



Для мноства прыбораў патрабуюцца батарэйкі, мы мяняем іх часта. Горы адпрацаваных батарэек заканчваюць сваё жыццё ў смеццевых вёдрах, пакетах, і мала хто задумваецца, якую яны тояць небяспеку для прыроды.

Батарэйкі ўтрымліваюць у сабе небяспечныя цяжкія металы (кадмій, цынк, марганец, калій і г.д.), якія вельмі моцна забруджваюць навакольнае асяроддзе. Па ацэнцы вучоных адна батарэйка забруджвае 400 літраў вады або 20 квадратных метраў глебы!

Смецце, звычайна вывозіцца на звалкі, размешчаныя паблізу населеных пунктаў, дзе і адбываецца заражэнне глебы, з наступным пранікненнем гэтых элементаў у грунтавыя воды. Смецце таксама спальваюць, што прыводзіць да траплення таксічных адходаў і цяжкіх металаў у атмасферу.

У мэтах выхавання экалагічна граматных паводзінаў у навакольным асяроддзі трэба зразумець неабходнасць сартавання смецця і перадачы некаторых адходаў у прыёмныя пункты.



***Просім вас задумацца пра шкоду, якая наносіцца навакольнаму асяроддзю, і падтрымаць нашу акцыю, заклікайце сваіх знаёмых і сваякоў да правільнай утылізацыі батарэек, якія атручваюць Планету!***

***Матэрыял падрыхтавалі А.В. Жукоўская***
***і вучні 5 “Б” класа***

## Тыдзень геаграфіі



*Дом, у якім утульна ўсім!*
*№ 53, люты 2019 г.*









## *Парады ад МНС, як не спаліць вясной уласны дом…*

Яшчэ ляжыць снег, а ў Мінскім рэгіёне фіксуюцца першыя пажары сухой расліннасці: ужо гарэла трава на палях у паўднёвых раёнах вобласці. Пасля зімы людзі пачынаюць уборку падворкаў і агародаў, і адным з абавязковых мерапрыемстваў пры гэтым становіцца спальванне смецця. Штогод з-за кінутых без нагляду вогнішчаў і выпальвання сухой травы гараць жылыя дамы, лазні, адрыны. Часам – цэлыя вёскі. Сумны прыклад у нашым раёне – вёска Дашніца, якая цалкам згарэла ў маі 2014 года. Мінулай вясной, да прыкладу, толькі на загаранні сухой раслiннасцi i пажары пабудоў ад кінутых вогнішчаў бярэзінскія ратавальнікі выязджалі часам 5-8 (!) разоў за суткі. Класічная карціна: грамадзянін спальвае смецце на падворку, пакідае вогнішча ненадоўга. Усяго на пяць хвілін ... парыў ветру – і гарыць сухая трава вакол. Секунды – і агонь бяжыць да дома. Невялікае вогнішча ператвараецца ў разбуральную стыхію. У спробах патушыць полымя штогод дзясяткі чалавек у краіне атрымліваюць апёкі, ёсць і выпадкі гібелі. Пажары ж у палях нясуць вялікую шкоду экалогіі, могуць стаць прычынай лясных пажараў або паграджаць цэлай вёсцы.

Спальваць смецце не забараняецца. Аднак рабіць гэта трэба па правілах. Развесці вогнішча можна толькі на тэрыторыі свайго прысядзібнага ўчастка, на адлегласці не менш за 10 метраў ад будынкаў, у малаветранае надвор'е. Акапайце месца вакол вогнішча, пастаўце побач ёмістасць з вадой або вогнетушыцель, рыдлёўку. Ні на хвіліну не пакідайце вогнішча! Гэта – адна з самых вялікіх памылак грамадзян! Штрафы за парушэнні гэтых правілаў могуць дасягаць 30 базавых велічынь (765 рублёў). Калі ж будзе ўсталяваны факт шкоды экалогіі, пацерпяць пабудовы суседа або іншыя людзі, тут магчыма і крымінальная адказнасць. І калі спаліць на падворку смецце па правілах можна, то спальванне травы на корані, пажніўных рэшткаў, іржышча на палях катэгарычна забараняецца!

Задаць пытанні інспектару Бярэзінскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях вы можаце па тэлефоне 5-54-47. Таксама па гэтым нумары можна паведаміць пра факты выпальвання сухой раслiннасцi грамадзянамі і арганізацыямі.

Вольга Данейка, інспектар прапаганды і навучання Бярэзінскага РАНС





## ШОСТЫ ШКОЛЬНЫ ДЗЕНЬ

















# _Мінск – сталіца ІІ Еўрапейскіх гульняў_

_ІІ Еўрапейскія гульні пройдуць з 21 па 30 чэрвеня 2019 года ў сталіцы Беларусі – Мінску. У найбуйнейшым спартыўным форуме кантынента прымуць удзел больш за 4000 спартсменаў з 50 краін, якія разыграюць 199 камплектаў узнагарод у 15 відах спорту (23 дысцыплінах), а таксама ліцэнзіі на Алімпіяду-2020 у Токіа._

_На першых Еўрапейскіх гульнях-2015 у Баку зборная Беларусі паказала высокія вынікі, заняўшы ў агульным медальным заліку сёмае месца: нашы спартсмены заваявалі 43 узнагароды (10 залатых, 11 сярэбраных і 22 бронзавыя)._

_Рашэнне аб перадачы Беларусі права на правядзенне другіх Еўрапейскіх гульняў было прынята 21 кастрычніка 2016 года па выніках галасавання дэлегатаў з 50 краін на 45-м пасяджэнні Генеральнай асамблеі Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў (ЕАК) у Мінску._




_Важкімі аргументамі на карысць беларускай сталіцы сталі развітая спартыўная інфраструктура, вялікі вопыт правядзення міжнародных спаборніцтваў высокага ўзроўню, кваліфікаваныя спецыялісты і, вядома, падтрымка кіраўніка НАК – прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі._

**_Па матэрыялах https://www.belarus.by_**

ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета “Школьная планета” выходзіць адзін раз у месяц.
Творчы калектыў клуба “Юны журналіст”: Кацярына Бубенька, Паліна Кузіна, Паліна Маркевіч, Вікторыя Лапцёнак, Анастасія Бурая, Марына Лапцёнак, Аліна Жукоўская, Яна Сюмак